Правядзенне семінарскіх заняткаў у форме дзелавой гульні патрабуе значнай папярэдняй падрыхтоўкі як студэнтаў, так і самога выкладчыка. Калі толькі размеркаваць ролі і гэтым абмежавацца, дзелавая гульня сама сабой не пойдзе. Арганізацыя дзелавой гульні патрабуе ад выкладчыка глыбокай прафесійнай кампетэнцыі. На стадыі падрыхтоўкі яму трэба затраціць нямала часу на кансультаванне студэнтаў, дапамагчы ў падборы літаратуры.

Пры выкладанні курса эканамічнай тэорыі і эканомікі культуры выкарыстоўваюцца і іншыя актыўныя формы навучання. Намі назапашаны таксама вопыт ужывання тэстаў безмашыннага кантролю. Іх прымяненне дазваляе рашаць многія задачы, накіраваныя на паляпшэнне эканамічнай падрыхтоўкі спецыялістаў культуры.

Фамін У.А.,
канд.філас.навук,
дацэнт

## НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ ЭТЫКЕТУ ЗАМЕЖНАГА ПАРТНЁРСТВА

У міжасобасных зносінах заўсёды вялікая роля надавалася этыкету міжнародных адносін. Тым больш на гэта трэба звярнуць увагу ў наш час, калі пачалі наладжвацца шырокія сувязі з замежжам. Можна нагадаць некалькі правілаў паводзін, якія трэба ведаць кожнаму, хто мае намер уступіць у кантакт з замежнымі бізнесменамі, навукоўцамі.

Возьмем вопратку. Гэта першы крок да поспеху. Справа ў тым, што па належным гарнітуры іншаземцы ў нейкай ступені мяркуюць аб нашай надзейнасці. Так, у ЗША, Германіі, Францыі не прынята насіць мужчынам цяжкія залатыя пярсцёнкі, бранзалеты, пярэстыя гальштукі. Гэтыя рэчы могуць выклікаць падазронасць да субяседніка. А вось прадстаўнікі бізнесу арабскіх краін, наадварот, дэманструюць раскошу.

Для першага кантакту з іншаземцам, ды і надалей, трэба апрануць калі не новы, то старанна вычашчаны і адпрасаваны гарнітур са светлай сарочкай і гальштукам у тон.

У час перамоў этыкет строгі. Напрыклад, японцы нават тады, калі душна, не здымаюць пінжак. Намнога больш вольна паводзяць сябе амерыканцы і еўрапейцы. Але і яны ніколі не з'яўляюцца на перамовы ў сарочцы з гальштукам.

Іншаземцы вельмі наглядальныя. Так, у іх выклікаюць гідлівасць кароткія ці вельмі зморшчаныя шкарпэткі. Псуюць уражанне паўадарваныя гузікі, звычка праціраць акуляры гальштукам, нясвежая альбо скамечаная насоўка.

Абутак павінен быць не толькі добра начышчаны, але і гарманіраваць са штанамі.

Ваша акуратнасць, падцягнутасць прымусяць партнёра падумаць, што гэткім жа акуратным вы будзеце і ў справе. Ад першай сустрэчы многае залежыць.

Але гэта вонкавы бок справы. Галоўнае - заключыць выгаднае пагадненне. Каб яно было такім, трэба старанна падрыхтавацца да сустрэчы, прадумаць: якую ставіш мэту, што прапануеш, што хацеў бы атрымаць узамен ад другога боку. Пры гэтым трэба адказаць на пытанні з пэўным веданнем тэхнічных, эканамічных, навуковых дэталей.

Трэба загадзя глыбока вывучыць юрыдычныя аспекты будучага пагаднення. Здараецца ж, што замежныя партнёры ў яго дэталі глыбока не ўнікаюць. А іншы з ахвотай бярэ на сябе прапрацоўку дакумента. Трэба тут быць пільным, бо не выключана, што вы натрапілі на дзялка, які любым шляхам хоча адхапіць куш.

Для ўмацавання ўзаемаадносін паміж партнёрамі важную ролю адыгрывае разнастайная абавязковая атрыбутыка: візітныя карткі, сувеніры. Да візітнай карткі ёсць пэўныя патрабаванні: павінна быць надрукавана на англійскай, па магчымасці і мове краіны, дзе падпісанне пагаднення адбываецца. У ёй указваюцца не толькі ваша пасада, але і сфера вашых службовых абавязкаў.

На картцы абавязкова павінен быць паштовы адрас фірмы, навучальнай установы, нумар тэлефона, тэлекса, тэлефакса. Калі ў вас ёсць сакратарка, укажыце нумар і яе тэлефона.

Наконт сувеніраў. Этыкет прадугледжвае, што ў час першай сустрэчы падарункі падносяць гаспадары, а не госці. Дарыць можна невялікія аўтарскія карціны, чаканку, наборы каньяку, фірменнай гарэлкі. Самавары, матрошкі не варта, бо яны ўжо з лёгкай рукі прадстаўнікоў СНД запаланілі ўвесь свет. Не трэба таксама падносіць гадзіннікі, асабліва дзелавым людзям тых краін, дзе наладжана іх масавая вытворчасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

І яшчэ трэба памятаць. Ні ў якім выпадку нельга ўручаць аднолькавыя падарункі прэзідэнту фірмы альбо іншаму кіраўніку і яго падначаленым. Гэта будзе першым разлічана як вялікая абраза.

Карацей кажучы, азбука дзелавога этыкету далікатная, але не такая ўжо невырашальная справа. Пры жаданні ёю можа авалодаць кожны.

Шыршоў І.Я.,
канд.філас.навук,
дацэнт

## РОЛЯ КУЛЬТУРАЛОГІІ Ў ПРАЦЭСЕ ПЕРАХОДУ ДА ШМАТУЗРОЎНЕВАЙ СІСТЭМЫ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВА

Культуралогія з'яўляецца комплексам спецыяльных гуманітарных навук. Для ператварэння гэтага комплексу ў арганічную цэласную сістэму неабходна ўстанаўленне цесных інтэнсіўных катэгарыяльна-металалагічных сувязей, унутраных даследчых камунікацый паміж гэтымі навукамі. Можна ўмоўна вылзеліць два блокі апошніх.

Да першага блока ў вучэбным плане варта аднесці тэорыю культуры, гісторыю сусветнай і нацыянальнай культуры, сацыялогію культуры, эканоміку культуры, прававыя аспекты культуры.

У другі блок правамерна ўключыць аксіялогію культуры (аксіяметрыю), семіотыку культуры, тэорыю камунікацыі, антрапалогію культуры, этналогію, а таксама гісторыю еўрапейскай і сусветнай цывілізацыі, якая ўключае пытанні станаўлення і развіцця канфесій.

На мяжы прадметнай сферы культуралогіі вырысоўваюцца сумежныя з вышэйпералічанымі дысцыплінамі галіны гуманітарных ведаў: філасофія, мастацтвазнаўства, літаратуразнаўства, рыторыка, параўнальнае мовазнаўства, міфазнаўства, фалькларыстыка, мэнеджмэнт культуры, праектаванне развіцця культуры, а таксама аналітычная статыстыка і інфарматыка. Яны арганічна дапаўняюць культуралогію і ўтвараюць блок дапаможных прадметаў пры падрыхтоўцы прафесіяналаў па адпаведнай спецыяльнасці.

Блокі культуралагічных і мяжуемых з культуралогіяй дысцыплін можна акрэсліць умоўнымі канцэнтрычнымі кругамі, абазначыўшы этапы прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў дадзенага профілю на І і ІІ курсах, затым ІІІ і ІУ курсах, на У курсе з прысваеннем кваліфікацыі выкладчыка-культуролага (і навуковага работніка ў галіне культуры).

Студэнтам, якія паспяхова засвоілі ў Беларускім універсітэце культуры першы і другі блокі культуралагічных дысцыплін і дадатковыя спецкурсы ў якасці профілюючых прадметаў па пашыранай праграме, здалі дзяржаўны экзамен і абаранілі дыплом па спецыяльнасці "культуралогія", прысвойваецца кваліфікацыя культуролаг-бакалаўр, выкладчык культуралогіі, тэорыі і гісторыі культуры сярэдніх навучальных устаноў.

Студэнтам, якія паспяхова засвоілі ў Беларускім універсітэце культуры першы, другі, трэці блокі культуралагічных і дапаможных дысцыплін, праслухалі дадатковыя спецкурсы ў якасці профілюючых прадметаў па пашыранай праграме і абаранілі навуковую магістэрскую працу, прысвойваецца кваліфікацыя культуролаг-магістр, выкладчык культуралогіі, тэорыі і гісторыі культуры вышэйшых навучальных устаноў.

Контурна акрэсленая мадэль двухузроўневага навучання студэнтаў па спецыяльнасці "культуралогія" можа служыць матрыцай для падрыхтоўкі ва універсітэце кадраў культуры і мастацтва па іншых спецыяльнасцях. У ходзе такой падрыхтоўкі, ажыццяўляемай як на факультэце культуралогіі, так і на факультэтах мастацкай творчасці, бібліятэчных і інфармацыйных сістэм, неабходна прадугледзець дыферэнцыраванае вывучэнне студэнтамі культуралагічных дысцыплін, але ўжо ў якасці непрофільных у аб'еме, вызначаемым іх спецыялізацыяй. Пры гэтым па выбары студэнтаў могуць уводзіцца адпаведныя спецыялізацыі факультатывы (спецкурсы) культуралагічнага цыкла. Студэнты, якія прэтэндуюць па другой спецыяльнасці на ступень бакалаўра, магчыма, павінны асвоіць культуралагічныя дысцыпліны першага блока, а бакалаўры, якія працягваюць навучанне з мэтай атрымання магістэрскай ступені, павінны будуць выканаць вучэбны план па культуралагічных дысцыплінах і другога блока, а таксама ў абавязковым парадку здаць дадатковы дзяржаўны экзамен па культуралогіі.

Для асоб, скончыўшых перад паступленнем у Беларускі універсітэт культуры сярэднія спе-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ